# Прынцып нумар адзін

## Трыццаць год часопіс выходзіць пад назвай «Беларуская думка»

Сёлета ў кастрычніку роўна 30 год, як наш часопіс выходзіць пад назвай «Беларуская думка». Ні многа ні мала гэта мінімум 360 «тоўстых» нумароў, сотні журналісцкіх матэрыялаў і навуковых прац, безліч камандзіровак, сустрэч, мерапрыемстваў… Гэта радасць і неймавернае задавальненне ад творчай працы, трыумф прафесійных перамог, цеплыня чалавечых стасункаў і шмат чаго яшчэ, пра што праз гады ўжо і не згадаеш. Гэта цэлае Жыццё, у якім усё дробязнае, не вартае ўвагі і нашай памяці адыходзіць на другі і трэці планы, даючы дарогу істотнаму, самаму важнаму і незаменнаму. Для былых і сённяшніх супрацоўнікаў «Беларускай думкі», я перакананы абсалютна, на ўсе часы такім бясспрэчным мэйнстрымам, жыццёвым і творчым прынцыпам нумар адзін з'яўляецца адданасць любімай справе і шчырае жаданне рабіць яе так, каб лепей было роднай краіне. Часопіс не газета, у нас няма патрэбы пасяваць за кожнай навіной і бегчы, бегчы, імкнучыся дагнаць час… Наша задача, на мой погляд, больш складаная і адказная – разважліва і ўдумліва аналізаваць падзеі і працэсы, што адбываюцца ў сучасным грамадстве, шукаць людзей, якія, як і мы, дбаюць пра Беларусь, клапоцяцца пра яе заўтрашні дзень, маюць свой погляд на тое, як нам жыць і будаваць жыццё ў сваёй незалежнай краіне. Такое «нестрымгалоў», як ні парадаксальна, дае магчымасць быць актуальнымі і нават зазірнуць крыху наперад. Апроч таго, «Беларуская думка» – прызнаны своеасаблівы навукова-тэарэтычны кластар. У нас ахвотна друкуюць свае працы слынныя айчынныя вучоныя і навукоўцы-пачаткоўцы. А добрая тэорыя, плённая навуковая спрэчка на старонках папулярнага і аўтарытэтнага выдання – гэта крок наперад у грамадскім развіцці, пошук аптымальных шляхоў вырашэння той ці іншай праблемы.

Сваю гісторыю сённяшняя «Беларуская думка» пачынала ў далёкім 1922 годзе, калі пабачыў свет часопіс «Вперед». Так што налета нашаму выданню споўніцца 100 гадоў! За такі працяглы час часопіс змяніў некалькі назваў, але заўсёды трымаўся сваёй пазіцыі. Пераемнасць – яшчэ адзін з тых грунтоўных прынцыпаў, якія ўласцівы яму. Гэта дапамагло не згубіцца ў мітусліва-імгненным інфармацыйным свеце і ва ўсе часы заставацца аўтарытэтным грамадска-палітычным

**У сталічным «Глобусе», што побач з паштамтам, «Беларуская думка» – адно з самых запатрабаваных выданняў**



і навукова-папулярным выданнем, адным з лідараў айчыннай журналістыкі.

Уласна «Беларуская думка» нарадзілася ў 1991-м дзякуючы намаганням і клопатам колішняга галоўнага рэдактара Уладзіміра Паўлавіча Вялічкі. Гэта быў складаны і непрадказальны час. Толькі-толькі прабіваліся першыя парасткі незалежнасці і суверэнітэту, краіну гайдала ва ўсе бакі. Павальны дэфіцыт, рост злачыннасці, абрыдлая балбатня чыноўнікаў… Яшчэ не было моцнай прэзідэнцкай улады, якая навяла б парадак, вызначыла курс маладой краіны і ўпэўнена павяла б яе да лепшага жыцця. Каму якая справа была да нейкага там часопіса?! Але ў вопытнага і дасведчанага ў бюракратычных тонкасцях У. Вялічкі хапіла імпэту і настойлівасці пераканаць: такі часопіс, як «Беларуская думка», вельмі патрэбен незалежнай Беларусі, бо гэта выдатная пляцоўка для генерацыі і папулярызацыі новых ідэй і поглядаў на жыццё. Так і сталася: многія гады ўжо менавіта «Беларуская думка» – галоўнае інтэлектуальные выданне краіны, дзе найперш цэніцца грунтоўнасць, значнасць, кругагляд, прадбачанне.

Несумненна, новае творчае дыханне «Беларуская думка» набыла ў 2007 годзе, калі рашэннем заснавальніка – Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – часопіс перадалі пад крыло БЕЛТА. Без перабольшвання, гэты крок меў лёсавызначальны сэнс для выдання. Супрацоўнікі атрымалі магчымасць карыстацца найбагацейшым фотаархівам галоўнага інфармацыйнага агенцтва краіны. А самае важнае – трапілі ў надзвычай творчае і спрыяльнае асяроддзе, у якім выразна адчуваецца подых часу, дзе ўсё падпарадкавана інтэлекту і яе вялікасці Інфармацыі. Мае калегі імкнуцца адпавядаць высокім стандартам, ствараючы чарговы нумар «Беларускай думкі», працягваючы яе слаўную гісторыю. Як у нас атрымліваецца, меркаваць найперш чытачам.

Неяк па дарозе з працы прыйшла ў галаву дзіўная думка. А, можа, не такая яна ўжо і незвычайная, як камусьці падасца. Вось калі «пералічыць» узрост нашага часопіса на чалавечы век, гэта колькі будзе? І па якой методыцы рабіць такую карэляцыю, на падставе якіх крытэрыяў, з улікам якіх фактараў? Доўга ламаў галаву і ўсё ж прыйшоў да высновы, што гэта марны занятак. Пэўна, няма такіх ацэначных момантаў, каб зрабіць падобны «пераразлік» – нельга неяк штучна адарваць «Беларускую думку» ад кожнага дня і года, што пражывае родная краіна і яе насельнікі. Таму няхай будзе так, як ёсць!

Рыхтуючыся да 100-гадовага юбілею нашага выдання, сёння згадваем тыя 30 гадоў, якія яно жыве з вельмі красамоўнай назвай – «Беларуская думка». Гэта быў вельмі плённы і цікавы час. Няхай так яно будзе і надалей!

Са святам, сябры!

***Ігар ГАНЧАРУК***